***Антановіч Н.М.*** *(Мінск)*

# АСАБЛІВАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Навучанне грамаце – пачатковы этап сістэматычнага вывучэння беларускай мовы, які закладвае аснову лінгвістычнага і разумовага развіцця вучняў. Вядучымі падыходамі да пабудовы вучэбнага працэсу выступаюць асобасна арыентаваны, лінгвакультуралагічны і кампетэнтнасны. Асаблівую актуальнасць у сучаснай адукацыі набывае кампетентнасны падыход, у адпаведнасці з якім на першае месца вылучаецца не сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, а здольнасць вучня самастойна вырашаць актуальныя задачы [2].

Кампетэнтнасны падыход пры навучанні грамаце прадугледжвае разам з авалодваннем моўнымі навыкамі (фанетычнымі, граматычнымі, лексічнымі) развіццё ў вучняў уменняў супастаўляць, аналізаваць, сістэматызаваць атрыманую моўную інфармацыю, прымяняць яе ў практычнай дзейнасці згодна з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя названага падыходу стварае ўмовы для атрымання вучнямі асобасных, прадметных і метапрадметных вынікаў. Адзначаныя вынікі канкрэтызаваны ў вучэбнай праграме “Навучанне грамаце” для 1-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017 г.).

Да ***асобасных вынікаў*** належаць цікавасць да вывучэння беларускай мовы, імкненне авалодаць пісьмом як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў пісьмовай форме; пазітыўныя адносіны да чытання, уменне згодна з пастаўленымі мэтамі выбіраць патрэбную кнігу [1].

***Прадметныя вынікі*** прадугледжваюць авалоданне элементарнай тэхнікай чытання і пісьма; сфарміраванасць першапачатковых уяўленняў пра лексічныя, арфаэпічныя, граматычныя нормы беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету; здольнасць будаваць нескладаныя звязныя выказванні для вырашэння камунікатыўных задач; уменне спісваць невялікі па аб’ёме тэкст, пісаць пад дыктоўку асобныя словы і сказы; валоданне пачатковымі навыкамі сэнсавага чытання тэксту, чытацкай самастойнасці, наяўнасць чытацкага элементарнага кругагляду – уяўленняў пра творы, іх аўтараў, жанры [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Метапрадметныя вынікі*** ўключаюць універсальныя вучэбныя дзеянні (пазнавальныя, рэгулятыўныя і камунікатыўныя), якія забяспечваюць авалоданне ключавымі кампетэнцыямі, што складаюць *аснову ўмення вучыцца*. У перыяд навучання грамаце ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай неабходна звярнуць увагу на развіццё наступных кампанентаў: дзейснага – здольнасці да актыўнай творчай дзейнасці ў пазнанні моўных з’яў; інтэлектуальнага – валоданне простымі дзеяннямі аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення, класіфікацыі моўных адзінак; камунікатыўнага – уменне ўстанаўліваць кантакты, разумець выказванні іншага чалавека і выражаць свае пачуцці, эмоцыі, жаданні, задаваць пытанні, аргументаваць свае суджэнні; інфармацыйнага – здольнасці арыентавацца ў такіх крыніцах інфармацыі, як кніга, расказ дарослага або аднагодкаў, схема; прымяняць атрыманую інфармацыю ў сваёй дзейнасці [1].

З мэтай рэалізацыі кампетэнтнага падыходу ў працэсе навучання грамаце лічым неабходным прапаноўваць кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні, накіраваныя на авалоданне вучнямі лагічных дзеянняў параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі, групоўкі; выпрацоўку ўмення ўстанаўліваць узаемасувязі і заканамернасці; работу з мадэлямі (схемамі сказаў); выкананне заданняў пошукавага і творчага характару; прагназаванне мэты і задачы вучэбнай дзейнасці; авалоданне навыкамі сэнсавага чытання тэкстаў, пошуку ў тэксце відавочнай інфармацыі і яе апрацоўку. Пры распрацоўцы заданняў неабходна ўлічваць узроставыя і псіхалагічныя асаблівасці вучняў 1-га класа, прынцыпы навуковасці і даступнасці.

Праілюструем адзначаныя віды заданняў і практыкаванняў канкрэтнымі прыкладамі.

*Заданні, накіраваныя на выкананне лагічных дзеянняў параўнання, аналізу, сінтэзу.*

Заданне “Складзіце словы”.

Злучыце склады першага і другога слупка, каб атрымаліся словы.

| | |
|---|---|
| сы- | ма |
| ра- | нат |
| ры- | ба |
| ка- | рок |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

му-                                раш

Гульнёвае заданне “Склады наадварот”.

Настаўнік называе слова і кідае мяч вучню, які ў слове мяняе месцамі склады, гаворыць новае слова і вяртае мяч настаўніку.

Лексічны матэрыял для гульні: Шура (рашу), кара (рака), марка (камар), мара (рама), лаза (зала), вужы (жыву), салі (ліса), ліпа (палі) і інш.

*Заданні на класіфікацыю і групоўку моўнага матэрыялу па пэўнай прыкмеце.*

Гульнёвае заданне “Прыгатуем кексы”. Да дошкі прымацоўваюцца прадметныя малюнкі, на якіх адлюстраваны тварог, кефір, масла, мука, яйкі, цукар, сода, бананы, вішні. Вучням неабходна выбраць кампаненты, якія спатрэбяцца для прыгатавання кексаў. Назвы кампанентаў павінны пачынацца з цвёрдага зычнага гука.

Вучні называюць прадмет, вызначаюць у слове першы гук і пакідаюць на дошцы малюнкі, у назве якіх першы гук – зычны цвёрды.

Заданне “Размяркуйце на групы”. Вучням дэманструюцца карткі з друкаванымі літарамі Ш Р К П М Т Д С Л Н і прапануецца вызначыць прымету, па якой іх можна размеркаваць на дзве групы.

*Заданні на ўстанаўленне ўзаемасувязей і заканамернасцей.*

Заданне “Знайдзіце пару”. Прачытайце словы, запісаныя ў левым слупку. Знайдзіце пару да кожнага слова сярод тых, што запісаны ў правым слупку. Абгрунтуйце свой выбар.

| | |
|---|---|
| кветка | *красавік* |
| дрэва | *талерка* |
| посуд | *аўтобус* |
| транспарт | *нарцыс* |
| месяц | *бяроза* |

Заданне “Назавіце імёны”.

Прачытайце. Якія словы прапушчаны? Падбярыце пару да кожнага слова.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Юля | Міша | ? | Віця | ? | ? |
| Юлія | ? | Вольга | ? | Алена | Мікалай |

*Заданні на авалоданне ўменнямі працаваць з мадэлямі (схемамі сказаў).*

Паслухайце тэкст. “Зашыфруйце” кожны сказ з дапамогай асобнай схемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*У Аліны ёсць свая градка. На ёй расце морква. Яе дзяўчынка пасадзіла сама. Аліне дапамагала мама. Яна ўскапала градку.*

Пабудуйце сказ на тэму “Школа”, які адпавядае наступнай схеме:



*Заданні на пошук спосабу дзеяння.*

Заданне “Хованкі”. Знайдзіце і зафарбуйце “схаваныя” словы (лексічны матэрыял можа быць запісаны на дошцы або на картках).

| | |
|---|---|
| БРУЧКА | БУРАК |
| ІРЫС | ДУДАР |
| БОРШЧ | КАРАБЕЛЬ |
| ЛІСТАПАД | ПАРАСОН |

*Заданні творчага характару.*

Маўленчая сітуацыя “Дапамажыце сябру вывучаць беларускую мову”. Апішыце сябру кнігу, якая вам вельмі падабаецца. Якія словы выкарыстаеце для гэтага?

Настаўнік вызначае тэму, напрыклад, “Мая Радзіма” і прапануе вучням прыдумаць як мага больш сказаў на гэту тэму.

*Заданні на прагназаванне мэты і задач вучэбнай дзейнасці.*

Заданне “Адшукайце домік”. Да дошкі прымацоўваюцца малюнкі і схемы слоў.





Прыкладныя малюнкі: вясёлка, рыдлёўка, жолуд, кавун, лесвіца, гіра, чайнік.

Што адлюстравана на малюнках? Падумайце і сфармулюйце заданне, якое неабходна выканаць.

Пры выкананні задання вучань перад тым, як размясціць малюнак пад схемай, называе адпаведнае слова і вылучае ў ім першы гук.

Заданне “Карэктар”.

Прачытайце сказы і сфармулюйце заданне, якое неабходна выканаць.

Пасля фармулёўкі задання вучні знаходзяць у кожным сказе словы, якія трэба замяніць. Вусна выпраўляюць памылкі.

Прыкладны матэрыял для практыкавання:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мурашы спяваюць прыгожыя песні.

Верасень – першы месяц зімы.

Дрэва, на якім растуць яблыкі, – рабіна.

Вулей – гэта скрыня невялікіх памераў для павукоў.

Прынцыповыя адрозненні кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў і практыкаванняў ад традыцыйных заключаюцца ў арганізацыі пошукавай і творчай дзейнасці для рашэння новых вучэбна-пазнавальных задач вучнямі. Выкананне заданняў адзначаных відаў будзе павышаць матывацыю вучэння, актывізаваць разумовую дзейнасць, садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей вучняў, ствараць умовы для дасягнення вучнямі прадметных, метапрадметных і асобасных вынікаў, адзначаных у вучэбнай праграме па навучанні грамаце.

ЛІТАРАТУРА

1. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання: 1-шы клас / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017. – 106 с.

2. Лебедев, О. Е. Компетентностный подход в образовании / О. Е. Лебедев // Школьные технологии. – 2004. – № 5. – С. 3-12.

*The article deals with the problem of the implementation of a competence approach in the process of literacy training. The presentedtasks will help pupils to master the logical actions of comparison, analysis, synthesis, generalization, classification, grouping; to develop the skills ofestablishing relationships and regularities; to work with sentence patterns; to carry out tasks of search and creative nature; to predict the goals of educational activities.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ